# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ



***БЛАНК ЗАДАННЯЎ***
**9 клас**
**Варыянт 2**

*Магілёў, 2022 год*

Шаноўныя дзевяцікласнікі!
У нашай краіне 2022 год аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Гэта тое, без чаго немагчыма ўявіць сабе будучыню. Ведаць родную гісторыю, мову і літаратуру, берагчы іх – значыць быць сапраўдным патрыётам. Шануйце нашу спадчыну!

**Заданне 1.** Наш класік Янка Купала вядомы, акрамя іншага, сваёй схільнасцю і здольнасцю да словатворчасці. Вельмі прыкметна гэта выявілася на прыкладзе складаных слоў.

Прачытайце фрагменты яго твораў і вызначце, якім чынам былі ўтвораны вылучаныя складаныя словы. У адпаведнасці з гэтым упішыце ў ячэйкі табліцы (з улікам патрэбнай іх колькасці) паасобна ўсе **кампаненты** адпаведнага складанага слова **(акрамя канчатка)**, якія былі **задзейнічаны ў словаўтварэнні.**

Вызначце таксама, у якасці чаго ўзяты для ўтварэння складанага слова кожны з кампанентаў (як аснова слова, цэлае слова, суфікс і г. д.) і адзначце гэты яго статус у адпаведнай ячэйцы.

Утваральную аснову трэба паказваць як вылучаную частку ў складзе слова, напрыклад: *малад-(ы)*. Калі ад асновы адсякаецца пэўны яе фрагмент, гэта трэба паказваць так: *піл/ава-(ць)*.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

***Фрагменты Купалавых твораў:***

1. З гальных ліп і бяроз
Лісты валяцца,
Між павалаў і лоз
Рассыпаюцца.
Шапацяць, шалясцяць
Залацістыя,
Веткі ў неба глядзяць
***Пусталістыя***.

2. Нуда гняце з днём кожным болей,
Быт спавівае чарнатой, –
Як ***сухавей*** у чыстым полі
Гуляе з зернем-сіратой.

3. Не пра быўшае кайданнае
Гэту песню я складаю,
А пра з’яву нечаканую,
Што сягоння шчасна маем.
Не пра цемру беспрасветную,
Што людзям сляпіла вочы,
А пра яснасць ***зорнацветную***,
Што развеяла нам ночы.

4. Вам, ***цемратворцам*** блізкім, далёкім,
Шлю свой прывет і ласку ад сэрца;
Дзякуй шлю вам, шмялям слепавокім,
Дзякуй! Хай далей моц ваша прэцца!

5. ***Станогае*** Ліха-Нядоля
Валочыцца з поля на поле;
А вочы ў яго – што ў начніцы,
А рукі ў яго – чараўніцы.

6. Здароўе рымлянца!
Хай Рым жыве, новы пан ***светаўладны***,
Элінскай славы праслаўны наследнік!

**Заданне 2.** У фрагментах 1–3 Купалавых твораў, змешчаных у заданні 1, знайдзіце словы, у складзе якіх маюцца мінімум два мяккія зычныя гукі. Упішыце гэтыя словы ў табліцу, размеркаваўшы іх у адпаведнасці з колькасцю мяккіх зычных.

**Заўвага.** Словы запісвайце ў той форме, у якой яны ўжыты ў творы. Спалучэнне *зернем-сіратой* трэба разглядаць як дзве асобныя адзінкі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Заданне 3.** Уважліва разгледзьце схему. У бланку адказаў дапішыце сказы, улічваючы ступень сваяцтва розных людзей.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*



**Заданне 4.** Пасля аднаўлення сапсаванага вірусам тэксту рэдактар паспрабаваў максімальна аднавіць тэкст, зрабіў лексічную, арфаграфічную і пунктуацыйную праўкі. Аднак, абмежаваны ў часе, зусім забыў на сінтаксічную праўку. Давайце дапаможам рэдактару знайсці і выправіць сінтаксічныя памылкі. Выпішыце памылку, запішыце правільны варыянт і тлумачэнне неабходнасці праўкі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Усяслаў штодня поплеч з майстрамі працаваў на верфі. Спрактыкаваны майстар Руба, паплечнік князя, вельмі хутка асвойваў тэхніку пабудовы караблёў. Праз некалькі месяцаў тры судна памерам больш дзесяці метраў былі гатовы. Неўзабаве князь ***заклаў*** уласную верф для пабудовы лодак і караблёў. Майстар Руба кіраваў на верфі, які здабыў найбольшы вопыт у карабельных справах.

Усяслаў і яго гандляры з Полаччыны не толькі заўжды прывозілі на радзіму каштоўнасці і ўсялякае дабро, але і новыя ўражанні. ***Вярталіся*** яны з унікальнымі ведамі і неацэнным набытым досведам у іншых народаў, якія неўзабаве ўжывалі на карысць роднай зямлі. Маючы добрыя набыткі, за ўласныя сродкі заможнымі купцамі ***ўзводзіліся*** шыкоўныя палацы на берагах рэк і азёр.

Князь, аднак, не забываўся на інтарэс дзяржавы. Збор даніны – яго нязменны клопат. Ніхто не асмельваўся ўхіляцца ад падацяў у дзяржаўную казну. Тых, хто спрабавалі пярэчыць волі князя, чакала жорсткае пакаранне – збіццё, пазбаўленне маёмасці, ганебнае выгнанне з Полацкай зямлі (*Паводле І. Саверчанкі*).

**Заданне 5.** Вызначце спражэнне падкрэсленых у папярэднім заданні дзеясловаў. Утварыце ад іх: 1) форму інфінітыва; 2) форму 2-й асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу (з абавязковай пастаноўкай націску); 3) дзеепрыслоўе.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Заданне 6.** У папярэднім тэксце (першы абзац) знайдзіце слова *вопыт* і адкажыце, ці адпавядаюць яму наступныя прыметы (у графе “Правільна” табліцы насупраць правільных сцверджанняў пастаўце “плюс”).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Раньше Ваня почти не обращал внимания на воронки, попадавшиеся ему на пути. Они его не касались, он знал, что “это” уже совершилось, что опасность миновала. Теперь же он вдруг увидел их совсем по-иному. Немецкие снаряды только что прилетали и разорвались вокруг пушки, оставив зловещие следы. Но ведь батарея не ушла. Пушка стояла на прежнем месте. Значит, немецкие снаряды в любой миг могли прилететь снова и на этот раз принести смерть. Казалось, самый воздух дышит вокруг смертью. Тень смерти лежала на тучах, на ёлочках, на земле. *(По В. Катаеву)*.

**Заданне 8.** Запішыце ў бланку адказаў літаратуразнаўчыя тэрміны, увасобленыя ў наступных схемах.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| | |
|---|---|
| **А** | Запішыце тэрмін, абазначаны пытальнікам (?)<br><br> |
| **Б** |  |
| **В** | <br> |
| **Г** |  |
| **Д** | Запішыце тэрмін, абазначаны пытальнікам (?)<br><br> |
| **Е** | … … … … гра***ду*** –<br>… … … заз***зялі***;<br>… … чара***ду*** –<br>… … … закраса***валі*** |

**Заданне 9.** Ці добра ведаеце творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа? Разгадайце крыжаванку.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

**Па гарызанталі:** 1. Якую страву гатаваў дзядзька Антось у бярозавым соку? 3. Янка Купала апісваў яе так: “Як маліны, яе губкі, / А твар, як лілея, / Як дзве зоркі, яе вочы, / Гляне – свет яснее”. 4. Месца нараджэння Янкі Купалы. 5. Як называюцца стопы, якія выкарыстаў паэт у наступным радку: “Паміж пустак, балот беларускай зямлі…”? 7. Асілак, які стаў галоўным героем паэмы “Магіла льва”. 8. Сапраўднае прозвішча Янкі Купалы.

**Па вертыкалі:** 2. Прозвішча Паўлінкі з аднайменнай камедыі Янкі Купалы. 3. “А хто там ідзе?” – пытаўся лірычны герой аднайменнага верша. Сапраўды, хто ж там ішоў? 6. Гэтае апавяданне Якуба Коласа пачынаецца так: “Ніякага клопату і гора не ведала гэта прыгожая белая <…>. Яна не ведала, з чаго і як радзілася на свет, адкуль узялася яна; не ведала нават, ці ёсць у яе маці”. 7. Сапраўднае прозвішча Якуба Коласа. 8. Месяц, калі нарадзіўся Якуб Колас. 9. Месца нараджэння Якуба Коласа.

**Заданне 10.** Уважліва разгледзьце змест зборніка «“Ад роду – да народу”: апавяданні і аповесці пра беларусаў і іх зямлю».

А. Патлумачце, чаму гэтая назва не спадабалася рэдактару выдавецтва.

Б. Прапануйце ўласную назву гэтага зборніка, зыходзячы з іншага прынцыпу яго ўкладання. У вас атрымаецца новы зборнік з тым жа зместам. Запішыце, чаму вы назвалі зборнік так.

В. Дапоўніце змест новага зборніка двума іншымі творамі, якія б адпавядалі прапанаванаму вамі прынцыпу і вывучаліся вамі ў школе.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

